*Тамара Бірукова*

# РОЛЯ СУЧАСНЫХ ФАЛЬКЛОРНЫХ КУЛЬТУРНА-АДПАЧЫНКАВЫХ ПРАГРАМ У ЗАСВАЕННІ ДУХОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ МОЛАДЗІ

Народная творчасць, фальклорна-эпічныя, лірычныя. драматычныя, музычныя і харэаграфічныя творы. народжаныя калектыўным мастацкім геніем самога народа - важная і неад'емная частка яго духоўнай культуры. У ёй адлюстраваны мары людзей працы, гісторыя народа, яго быт, гаспадарчы вопыт, грамадска-палітычныя і эстэтычныя ідэалы. Каб правільна ацаніць значэнне фальклору для нашага часу і зразумець яго значнасць, неабходна звярнуць увагу на асноўную рысу фальклорнай эстэтыкі, на тое, што гэта - «эстэтыка жыцця».

Узоры фальклору фарміраваліся ў ходзе шматвекавой практыкі народных мае, якія выхоўвалі ў чалавека эстэтычныя ідэалы, маральнае пачуццё, наогул тыя якасці, якія робяць чалавека прыгодным для грамадскага жыцця. Народная творчасць і сёння з'яуляецца жывой крыніцай, вялікай каштоўнасцю духоўнай культуры нашага народа і мае мастацка-эстэтычнае і выхаваўчае значэнне.

Хоць народная творчасць у сваіх спрадвечных масавых формах не памірае, свядомая арыентацыя на яе выкарыстанне ў культурна-адпачынкавай дзейнасці ўсё яшчэ недастатковая. Людзі часта праходзяць міма таго, што яна назапасіла, слаба выкарыстоўваюць яе ў адпачынкавых формах, недастаткова развіваюць мясцовыя выканальніцкія традыцыі. Гэта адлюстроўеваецца ў тым, што маладзежная аўдыторыя не ведае, а часта і не хоча ведаць тое, што народжана іх продкамі, тое, што можа іх звязваць з роднай зямлёй, яе традыцыямі, звычаямі, мастацкім вопытам многіх пакаленняў.

Сацыяльны педагог, які працуе ў культурна-адпачынкавай сферы, не можа паспяхова выконваць свае педагагічныя функцыі без таго, каб не звярнуцца да народнай педагогікі, без вывучэння традыцый, абрадаў, рытуалаў, фальклору, без усяго таго, што раскрывае духоўны патэнцыял беларускага народа. Шматлікія сцэнарыі фальклорных культурна-адпачынкавых праграм распрацоўваюцца на рэальна-бытавой, сацыяльнай, гістарычнай, святочна-абрадавай аснове. Імкненне да яркага мастацкага

21 Курсіў і выдзяленне доктара мастацтвазнаўства, прафесара, акадэміка І.Мацыеўскага *(Рэд.)*.

22 Штогадовая **мадэль:** Міжнародная **канферэнцыя** «Аўтэнтычны фальклор» +2 **канцэрты** «Фальклор беларускай глыбінкі» +2 Рэспубліканскія сезонныя **фальклорныя школы** для дзяцей, + Тыдзень фальклорна-этнаграфічных **фільмаў** для моладзі **+Рэвіталізацыя I** абрада сродкамі дыпломнікаў кафедры +культурна-антрапалагічная **экспедыцыя** для падрыхтоўкі рэвіталізацыі наступнага абрада (*каментар В.Капацэя)*.

афармлення рэальных падзей жыцця і працы чалавека, якое падкрэслівае іх сэнс і значэнне, выкарыстоўваючы традыцыйныя элементы, усе віды і жанры фальклора - усё гэта ўлічваецца ў рабоце над сцэнарыем фальклорных праграм.

Неабходна ўдакладніць. што сцэнарый культурна-адпачынкавых праграм - гэта асобым чынам зманціраваны разнародны мастацкі матэрыял, рэальныя падзеі жыцця канкрэтных людзей, стварэнне культурна-творчага асяроддзя, далучэнне прысутных да актыўнай творчай дзейнасці з раней вылічаным вынікам. Задача педагога - стварыць адпаведныя ўмовы засваення традыцыйнай культуры ў рамках прадмета «Асновы сцэнарнага майстэрства», што прадстаўляе безумоўную складанасць, але без ведаў гэтага матэрыяла немагчыма стварэнне добрага сцэнарыя. Але як кажуць у народзе, «Да чаго не дойдзеш, тое ў кніжцы знойдзеш», і мы звярнуліся да спецыяльнай літаратуры, да вопыту вядучых фалькларыстаў Беларусі (Аляхновіч А.М., Барташэвіч Г.А., Грымаць А.А.. Кабашнікаў К.ГІ., Лозка А. і інш.) [1-5].

На аснове вывучаемага матэрыялу быў распрацаваны шэраг трэнінгавых заняткаў «Сцэнарныя гульні». Гэта выкананне вызначанага задания, практыкавання. якое фарміруе тыя ці іншыя сцэнарныя навыкі і ўменні. [5] Сцэнарныя трэнінгі дапушчаюць калектыўныя творчыя сувязі з кіраваннем педагога і складаюць вызначаны цыкл: сюжэтна-ролевая гульня «Сцэнарны эцюд»; калектыўная імправізацыя: «Мазгавая атака»; «Сцэнарная эстафета» - пабудова логікі падзейнага раду сцэнарыя; практыкаванне па развіцці ведаў вершаскладання [4]. Гэтыя трэнінгі дапамагаюць фарміраваць драматургічнае мысленне студэнта, мастацка-творчае ўяўленне, неабходнае пры пошуку вобразнага рашэння праграмы. яе сюжэтнай пабудовы, адбору зыходнага матэрыялу і спроб яго перадачы.

Фальклорны матэрыял. прадстаўляючы спецыфічную галіну народнай творчасці, складае цэлую сістэму вусна-паэтычнага, музыкальна-песеннага, танцавальнага і іншых жанраў, дазваляе стварыць і раскрыць любы сюжэт, стварыць мастацкі вобраз праграмы, прыдумаць выразныя сцэнарныя хады (гэта і «Ярмарка» і «Рог багацця». «Бабулін куфар». «Беларускі пясняр»).

Напрыклад, у сцэнарыі «У гасцях у цёткі Лявоніхі» сцэнарным ходам было наведванне гасцямі хат, дзе гаспадынь клічуць Лявоніхамі; адна вельмі добрая гаспадыня. другая працавітая, трэцяя весялуха. чацвёртая адрозніваецца гумарам. гасціннасцю, а ўсе разам складаюць цэльны вобраз беларускай жанчыны.

Работа студэнтаў над сцэнарыямі фальклорных праграм ідзе ў розных напрамках: •мастацка-відовішчныя праірамы з мінімальнай актывізацыяй аудыторыі. таксама. як у «Зямлі пад белымі крыламі» па аднаіменнай кнізе Ул. Караткевіча. рэстаўрацыя народнага абраду «Жаніцьба Коміна» і інш.:

•сюжэтна-гульнёвыя праграмы з выкарыстаннем народнай гульні, фальклора і мастацкім вобразам «У гасцях у Несцеркі» і «Як Сымон-музыка грае» і інш,

•конкурсна-забаўляльныя праграмы «Вясельны карагод», «У гасцях у цёткі Лявоніхі» і інш.;

•комплексныя культурна-адпачынкавыя праграмы-пасядзелкі. вячоркі. на якіх я затрымаюся больш падрабязна. таму што яны складаюць большую частку распрацаваных сцэнарыяў і іх практычнае ажыццяўленне адбываецца на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старэйшых курсах у рамках прадметаў «Гульнёвая-дзейнасць», «Культурна-рэкрэацыйная дзейнасць», «Мастацтва слова» і інш.

Сацыяльна-гіедагагічная каштоунасць традыцыйных форм правядзення вольнага часу на сяле - вячорак і пасядзелак - заключаецца ў тым. што яны былі не толькі разнавіднасцю зносін. але вельмі добрай школай такіх зносін. Насычаныя цудоўнай сімволікай. яны выхоўвалі нябачна, тонка, паволі. Паэтычна і музычна афармленыя, яны прадстаўлялі сабой гульневы. ліродраматычны. харэаграфічны і музычны пласт народнай культуры. На пасядзелках вырабатываліся працоўныя навыкі, увасабляліся эстэтычныя ідэалы, прынятыя ў той ці іншай мясцовасці. Змест іх быў маляўнічым, яркім.

Пасядзелкамі да апошняга часу ніхто сур'езна не займаўся. няма амаль шго агульнапрынятага азначэння пасядзелак і вячорак. У.І. Даль у адзіны рад з паняццем «пасядзелкі» ставіць паняцці «вячоркі». «вечарніцы», «бяседкі», «засідкі», «досвідкі», «дазоркі». Але ў народзе вельмі добра алрозанівалі паняцці «пасядзелкі» і «вячоркі». Пасядзелкі - увесяленні, звязаныя з карыснай працай. а вячоркі - форма, створаная выключна для адпачынку і баўлення часу.

Сучасныя пасядзелкі з'яўляюцца формай актыўнага адпачынку і адпачынкавых зносін. У іх ёсць таксама арганізацыйна-метадычная годнасць. аснову якой складае сукупнасць дзеянняў. кожны з прысутных крочыць гатовай лініяй паводзін. імправізуе па меры сваіх магчымасцяў.

У цяперашні час адпачынкавыя пасядзелкі атрымалі самыя розныя кірункі, хоць усе яны маюць у сваей аснове фальклорны матэрыял, народныя традыцыі і звычаі. Жыцце ўносіць у іх новыя моманты. Нашы даследаванні паказалі. што пасядзелкі як форма адпачынкавых зносін падзяляюцца на:

• пасядзелкі, якія ўключаюць элементы беларускіх звычаяў: «Вяселле». «Заручыны», «Дзявочая субота» і г.д.. каб сучаснае пакаленне ведала і выкарыстоўвала некаторыя рытуальныя дзеянні. песні. танцы, гульні ў сучасных сямейна-бытавых звычаях;

•пасядзелкі. якія выкарыстоўваюць відовішчна-гульневыя дзеянні каляндарна-абрадавых святаў: «Каляды», «Гуканне вясны», «Купалле» і інш.;

•пасядзелкі, якія прапагандуюць народнае мастацтва: «Заспяваю прыпеўку звонкую». «То не гармонік, душа пяе», «Вянок беларускіх танцаў», «Матчыны ручнікі» і г .д.:

•сямейныя пасядзелкі. дзе прысутнічае сацыяльна-бытавая аснова. якая раскрывае вопыт пакаленняў у сямейным жыцці, сямейным выхаванні і прывівае любоў да роднай зямлі, роднага дома.
напрыклад: «Цяпло роднага ачага», «Шчасцем падзяліся з іншым», «Хлеб на стале - радасць у хаце», «Мастацтва забаўляць гасцей» і інш.

Магчымасць станаўлення і развіцця дадзенай формы адпачынкавых зносін вызначаецца тым, наколькі самі работнікі культурна-адпачынкавай сферы ведаюць і любяць народнае мастацтва, прыўносяць яго ў адпачынкавую практыку.

У апошнія гады мы асабліва шмат гаворым і пішам пра пераемнасць лепшых узораў народнай культуры, якія прайшлі доўгі гістарычны шлях. Лічу, што правільна сказана: хто датыкаецца да звычаяў народа, у чые жыцце яны ўваходзяць як святыні, той звязаны са сваей зямлей моцнымі вузамі, якія не дазваляюць згаснуць памяці народнай.

У прапагандзе і творчым засваенні духоўнага багацця беларускага народа, іх актыўным уключэнні ў сучасную духоўную культуру, не апошняя роля належыць студэнтам і спецыялістам кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

**Спіс літаратуры**:


1. Аляхновіч, А, Лозка, А. Методыка кіравання фальклорным калектывам, ч.І, М., 2003. - 27с.
2. Барташэвіч, Г.А. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору / Г.А. Барташэвіч. - Мінск : Навука і тэхніка, 1976. - 116 с.
3. Барташэвіч, ГА Фальклор у сістэме выхавання / ГА. Барташэвіч *II* Праблемы выхавання. - Выа 1.-1995. - С. 70-75.
4. Масарскі, С.М. Сцэнарый нараджаецца ў клубе / С.М. Масарскі. - М., 1988. - 41 с.
5. Назарова, Л.Д. Фольклорная терапия / Л.Д. Назарова. - СПб., 2002. - 239 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ